1 (186)
студзень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар* *Максім Навумавіч Гальпяровіч*

*Рэдакцыйная калегія:*
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

*Рэдакцыйная рада:*
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

*Рэдакцыя:*
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

ЗМЕСТ

Слова ад рэдакцыі 3

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Якаў Рыер — Да сучаснага разумення паняцця "феадалізм" 4

ДЗЯРЖАВА І ПРАВА

Уладзімір Падалінскі — Галоўны з'езд Вялікага Княства Літоўскага: генезіс, функцыі, гістарычнае развіццё 13

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Наталля Трыфанава, Аляксей Харак — Яфім Спажынскі — беларускі мастак першай паловы XIX стагоддзя 24

## ЗМЕСТ

### ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ


| | | |
|---|---|---|
| Эмануіл Іофе | На чале Кампартыі Беларусі ў жніўні 1937 — чэрвені 1938 года: дзейнасць Аляксея Аляксеевіча Волкава | 28 |


### ІМЁНЫ ВЯДОМЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ


| | | |
|---|---|---|
| *Вітаўт Чаропка* | *Станіслаў Манюшка. Заснавальнік* беларускай оперы | *37* |


### МЕТОДЫКА. ВОПЫТ


| | | |
|---|---|---|
| Елена Говоркова | Город Могилев в древнейшие времена *(VI класс)* | 47 |
| Таццяна Мелехава | Гаспадарчае жыццё *(VII клас)* | 52 |
| | Настаўнік гісторыі — гэта рознабаковы развіты чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй *(матэрыял падрыхтавала Наталля Матусевіч)* | 58 |
| Галина Дудко | Образование и наука в первой половине XIX века *(IX класс)* | 59 |
| Наталля Бартошык | Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў Беларускай ССР *(X клас)* | 64 |
| Вячаслаў Лазіцкі | Сістэмная падрыхтоўка да абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі | 71 |
| | Содержание | 79 |
| | Summary | 80 |



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) "Беларускі гістарычны часопіс" уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*

***Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 211.***
***Тэлефон: 8(017) 395-79-11.***
***http://www.p-shkola.by;***
***e-mail: bhc.redaktor@tut.by.***
***РУП "Выдавецтва "Пачатковая школа".***
Падпісана да друку 20.01.2015 г.
Выхад у свет 27.01.2015 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 1/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 810 асобнікаў. Зак. 0042.
*Надрукавана ў друкарні ААТ "Прамдрук".*
*Ліцэнзія № 02330/233 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


***Да ведама аўтараў!***
***За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў допісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.***


© "Беларускі гістарычны часопіс", 2015.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Сістэмная падрыхтоўка да абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі

*Аўтар прапаноўвае комплекс метадаў, прыёмаў і сродкаў дзейнасці настаўніка і вучняў па эфектыўнай падрыхтоўцы да правядзення выніковай атэстацыі – абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі па выніках навучання на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі.*

Згодна з Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 95 ад 7 ліпеня 2014 г., з 2014/2015 навучальнага года ў школах уведзена абавязковая атэстацыя — экзамен па гісторыі Беларусі па выніках навучання і выхавання на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Пачынаючы з 1994 г. абавязковыя экзамены па ўсім курсе нацыянальнай гісторыі здавалі выпускнікі дзявятага класа, якія завяршалі навучанне ў базавай школе. Пры правядзенні экзамену па гісторыі Беларусі для выпускнікоў 2014/2015 і 2015/2016 гадоў навучання кантролю і ацэньванню падлягае ступень засваення школьнага гістарычнага матэрыялу, што вывучаўся ў X, XI класах — перыяд гісторыі Беларусі з 1917 г. да сучаснасці. Гэта абумоўлена тым, што выпускнікі бягучага года ўжо здавалі абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі ў IX класе — матэрыял па нацыянальнай гісторыі ад старажытных часоў і да пачатку XX ст.

Уключэнне вучэбнага прадмета "Гісторыя Беларусі" ў пералік дысцыплін, па якіх прадугледжваецца абавязковая выніковая атэстацыя выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных школ, патрабуе звароту настаўнікаў гісторыі да сістэмных падыходаў у падрыхтоўцы адзінаццацікласнікаў да экзамену. Статус абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі і спецыфіка школьнай адукацыі па гісторыі патрабуюць улічваць вельмі важныя навукова-метадычныя і практыка-арыентаваныя аспекты. На іх настаўнікам мэтазгодна звярнуць асаблівую ўвагу.

Адной з галоўных мэтаў экзамену па гісторыі Беларусі ў XI класе з'яўляецца ацэньванне ўзроўню засваення выпускнікамі зместу вучэбна-



***ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.***

*Загадчык кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Научно-методические основы создания и применения электронных средств обучения по дисциплинам социально-гуманитарного цикла (на примере истории)" (Мн., 2009), "Электронный учебно-методический комплекс по дисциплинам социально-гуманитарного цикла. Научно-методические основы создания и системного применения" (Мн., 2012); "Информационная компетентность как основа системного применения информационно-коммуникационных технологий в высшем образовании (на примере преподавания социально-гуманитарных дисциплин" (Пинск, 2013).*

га прадмета і вучэбнай дзейнасці адпаведна з палажэннем Канцэпцыі вучэбнага прадмета "Гісторыя Беларусі", патрабаваннямі Адукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы па прадмеце. У якасці аб'екта выніковай атэстацыі на экзамене неабходна разглядаць узровень засваення вучнямі фармалізаваных тэарэтычных і факталагічных ведаў аб працэсах развіцця грамадства, іх прычынна-следчых сувязях, а таксама нефармалізаваных "ведаў", якія праяўляюцца ва ўменні параўноўваць і ацэньваць гістарычныя з'явы, ацэньваць дзейнасць гістарычных асоб.

Трывалыя гістарычныя веды і спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца ў выніку сістэмнага выкарыстання настаўнікамі і вучнямі комплексу метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання, якія таксама спрыяюць эфектыўнай падрыхтоўцы да здачы экзамену. Пры арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці варта ўлічваць псіхалагічнае развіццё школьнікаў, іх узроставыя асаблівасці і пазнавальныя магчымасці, а таксама фарміраванне прафесійнага выбару. Адзначым, што адной з асаблівасцяў вывучэння гісторыі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца засваенне зместу гістарычнага матэрыялу на падзейна-храналагічным і праблемна-тэарэтычным узроўнях.

Як адзначалася вышэй, абавязковым элементам правядзення выніковай атэстацыі адзінаццацікласнікаў па гісторыі Беларусі павінен з'яўляцца ўлік дзейнаснага складніка — ацэньванне сфарміраванасці розных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Сярод іх вылучым наступныя:

— веданне тэарэтычнага зместу вучэбнага матэрыялу і ўменне ім аперыраваць (тлумачэнне гістарычных тэрмінаў і паняццяў; уменне рабіць тэарэтычныя высновы; суаднясенне гістарычных фактаў з працэсамі, з'явамі; вызначэнне прычынна-следчых узаемасувязяў і ўзаемаабумоўленасцяў гістарычных падзей і з'яў, іх тлумачэнне, раскрыццё характэрных прыкмет);

— веданне факталагічнага зместу вучэбнага матэрыялу і ўменне з ім працаваць (раскрыццё зместу гістарычных падзей з выкарыстаннем фактаў; параўнанне гістарычных падзей, працэсаў і з'яў па прапанаваных ці самастойна вызначаных вучнем прыкметах; абагульненне гістарычных фактаў і фармуляванне на гэтай падставе высноў; уменне характарызаваць дзейнасць гістарычных персаналій і творчасць дзеячаў мастацтва і культуры);

— храналагічныя веды і ўменні (вызначэнне вучнем храналагічных межаў гістарычных падзей, працэсаў і з'яў; вылучэнне асобных перыядаў і этапаў у гістарычных падзеях і працэсах, а таксама асэнсаванне іх працягласці, паслядоўнасці і сінхроннасці);

— картаграфічныя гістарычныя веды і ўменні (лакалізацыя гістарычнай падзеі ў гісторыка-геаграфічнай прасторы; вызначэнне месцазнаходжання вывучаных аб'ектаў на гістарычнай карце; выкарыстанне гістарычнай карты як крыніцы інфармацыі; вызначэнне сацыяльна-эканамічных і геапалітычных змяненняў, а таксама іх дынамікі на гістарычнай карце);

— веданне тыпаў гістарычных дакументаў і ўменне з імі працаваць (вызначэнне па тэксце дакумента храналагічнага перыяду; аналіз зместу гістарычнага дакумента для вылучэння галоўнай і дадатковай інфармацыі; пошук у дакуменце адрознення гістарычнага факта і яго інтэпрэтацыі; тлумачэнне пазіцыі аўтара дакумента як гістарычнай першакрыніцы);

— веданне розных пунктаў гледжання на гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы, дзейнасць гістарычных асоб і творчасць дзеячаў культуры, (уменне тлумачыць і суадносіць ацэначныя меркаванні, вызначаць у іх агульнае і асабістае; прадстаўленне свайго пункту гледжання на гістарычныя падзеі і іх удзельнікаў).

Аналіз тэарэтычных палажэнняў аб сістэмнай арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, а таксама абагульненне педагагічнага вопыту навучання школьнікаў старэйшых класаў дазваляюць вызначыць шэраг арганізацыйных і метадычных умоў, якія даюць магчымасць ажыццяўляць эфектыўную падрыхтоўку выпускнікоў да выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі і будуць спрыяць далейшай сацыялізацыі сённяшніх адзінаццацікласнікаў. Для арганізацыі такой падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі настаўнік гісторыі і вучань павінны ўлічваць наступнае:

— працэс падрыхтоўкі павінен грунтавацца на сукупным комплексе мерапрыемстваў арганізацыйнага і метадычнага характару, якія б забяспечвалі камфортныя ўмовы прафесійнай дзейнасці педагога і гарантаваную падрыхтаванасць адзінаццацікласніка да выніковай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў агульнай сістэме арганізацыі вучнёўскай працы па засваенні шматкампанентнага складу вучэбных гістарычных ведаў;

— арганізацыя працэса падрыхтоўкі павінна быць упарадкаванай і алгарытмічнай (вызначаюцца этапы падрыхтоўкі);

— адным з вядучых прынцыпаў падрыхтоўкі з'яўляецца прынцып пераемнасці, і таму ўвесь комплекс выкарыстоўваемых метадаў, прыёмаў і сродкаў падрыхтоўкі вучняў павінен абапірацца на ўжо засвоеныя веды і сфарміраваныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (вызначаць галоўнае і другараднае, асобнае і агульнае; абагульняць і сістэматызаваць атрыманыя веды; ацэньваць гі-

старычныя падзеі і факты; складаць розныя планы і параўнальна-абагульняючыя характарыстыкі; рабіць высновы і г. д.);

— у працэсе падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі вучань і настаўнік, як суб'екты педагагічнага ўзаемадзеяння, ажыццяўляюць сумесную дзейнасць дзеля дасягнення прафесійнага і вучэбнага поспеху.

Каштоўную дапамогу настаўніку і вучню ў падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі, экзамену па гісторыі Беларусі, акажа інфармацыйны рэсурс "Гісторыя Беларусі" (Гісторыя Беларусі. X—XI класы) на электронным сэрвісе платформы "MOODLE" (http://moodle.edu.by), які пачне працаваць у бліжэйшы час. У сваім дыдактычным інструментарыі ён, сярод іншага, змяшчае метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенні абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі па выніках навучання і выхавання на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Адзначым, што элементам індывідуалізацыі ў сістэме падрыхтоўкі да абавязковага экзамену з'яўляецца вучнёўская самаадукацыя і самакантроль. Для рэалізацыі дадзенага этапа падрыхтоўкі пры вывучэнні кожнай экзаменацыйнай тэмы мэтазгодна выкананне заданняў кантрольна-дыягнастычных комплексаў і іх далейшая праверка (у тым ліку і з дапамогай інструментарыя кантрольна-дыягнастычнага модуля інфармацыйнага рэсурса "Гісторыя Беларусі" — "Гісторыя Беларусі. X клас" на электронным сэрвісе платформы "MOODLE"). У рэжыме трэнінгу і карэкцыі ведаў і ўменняў вучань можа звярнуцца да настаўніка ці скарыстацца вучэбным дапаможнікам. Прадстаўлены модуль будзе садзейнічаць развіццю ўменняў сістэматызаваць і абагульняць засвоеныя веды, ажыццяўляць рэфлексію.

Алгарытмізацыя працэсу сістэмнай падрыхтоўкі да абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на тэматычныя пытанні згодна са зместам вучэбных праграм і вучэбных дапаможнікаў для X—XI класаў. Прапануем на прыкладзе вывучэння пытання экзамену "Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсталяванне савецкай улады: асаблівасці і вынікі пераўтварэнняў" разгледзець сістэму падрыхтоўкі адзінаццацікласнікаў да выніковага экзамену.

У нашым прыкладзе неабходнае метадычнае забеспячэнне патрабуе наяўнасці наступных сродкаў: вучэбны дапаможнік (Новік Я.К. Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг.: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў агульн. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання; аўтар метад. апарату В.В.Гінчук. Мн., 2012); хрэстаматыі (Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг. 10 клас. Хрэстаматыя / пад рэд. А.А.Кавалені. Мн., 2009; Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны). Хрестоматия / сост. А.А.Коваленя, М.А.Краснова, В.И.Лемешонок, С.Е.Новиков; науч. ред. А.А.Коваленя. Мн., 2008); метадычныя матэрыялы (Гінчук В.В. Гісторыя Беларусі ў 10 класе. Мн., 2014); кантрольна-дыягнастычныя матэрыялы (Гінчук В.В. Гісторыя Беларусі: тэставыя і рознаўзроўневыя заданні: 10—11 класы: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульн. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання. Мн., 2012); гістарычны атлас (Атлас. Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг. 10 клас / У.В.Тугай, В.М.Фамін. Мн., 2009).

Пасля прачытання вучнямі параграфаў "Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце", "Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці" ў вучэбным дапаможніку па гісторыі Беларусі для 10 класа вучням задаюцца пытанні на веданне фактаў аб падзеях Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсталявання савецкай улады ў Беларусі восенню 1917 г. На наступным этапе арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучню прапануецца скласці план адказа на пытанне экзамену, што дазволіць сістэматызаваць і ўпарадкоўваць веды. План можа мець наступны выгляд.

**План**

1. Сітуацыя ў Расійскай Імперыі напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі: а) наспяванне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу і яго прычыны; б) адносіны розных палітычных сіл да сітуацыі ў краіне; в) бальшавізацыя Саветаў і курс бальшавікоў на падрыхтоўку ўзброенага паўстання; г) асаблівасці сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў Беларусі напярэдадні кастрычніка 1917 г.

2. Узброенае паўстанне ў Петраградзе і пачатак усталявання савецкай улады ў Беларусі восенню 1917 г.: а) падзеі 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе і адносіны да іх палітычных сіл у Беларусі; б) барацьба бальшавікоў Мінскага Савета і Заходняга фронту з цэнтрамі контррэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі.

3. Стварэнне першых органаў савецкай улады ў Беларусі восенню 1917 г.

4. Першыя мерапрыемствы савецкай улады ў Беларусі і асаблівасці іх ажыццяўлення.

Далей вучням прапануюцца выпісаць: а) апорныя тэрміны і паняцці; б) назвы асноўных дакументаў; в) апорныя гістарычныя даты; в) асноўныя гісторыка-геаграфічныя назвы аб'ектаў па тэме; г) асноўныя ўдзельнікі падзей.

а) *Апорныя тэрміны і паняцці:* сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс; Часовы ўрад; бальшавізацыя; трохуладдзе; Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага; Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў; Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП; Вялікая беларуская рада (ВБР);

Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР); II Усерасійскі з'езд Саветаў; Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняй вобласці і фронту; Камітэт выратавання рэвалюцыі; Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах); Савет народных камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту; савецкая ўлада.

б) *Асноўныя дакументы:* Дэкрэт аб міры; Дэкрэт аб зямлі.

в) *Апорныя гістарычныя даты:* сакавік 1917 г., жнівень 1917 г., 25 кастрычніка 1917 г., 26 кастрычніка 1917 г., 2 лістапада 1917 г., 19—20 лістапада 1917 г., 25 кастрычніка — 20 лістапада 1917 г.

г) *Гісторыка-геаграфічныя аб'екты:* Петраград; Масква; Вільня; Мінск; Магілёў; акупаваная тэрыторыя Беларусі; неакупаваная тэрыторыя Беларусі.

д) *Гістарычныя персаналіі:* А.Ф.Керанскі, У.І.Ленін (Ульянаў), Л.Г.Карнілаў, М.П.Пралыгін, М.М.Духонін, Р.І.Берзін, М.В.Крыленка, К.І.Ландар, А.Ф.Мяснікоў, В.Г.Кнорын, М.У.Рагазінскі, Ц.І.Калатухін.

Трэба мець на ўвазе, што вызначэнне гісторыка-геаграфічных аб'ектаў, назвы якіх вучань выпісвае ў сшытак, неабходна лакалізаваць ва ўзаемасувязі з гістарычнымі фактамі з дапамогай гістарычнага атласа. Праца з гістарычнай картай з'яўляецца важным элементам падрыхтоўкі адзінаццацікласніка.

Прапаноўваем комплекс заданняў, якія можна выкарыстоўваць падчас правядзення экзамену па гісторыі Беларусі ў якасці трэцяга задания. У нашым выпадку ў якасці зместавага накірунка ў прыведзеных прыкладах выкарыстаны тэмы вучэбнай праграмы па гісторыі Беларусі ў X класе, якія ахопліваюць перыяд 1917—1945 гг.

1. Растлумачце, пра які гістарычны працэс сведчаць наступныя гістарычныя факты:

— разгортванне беларускага нацыянальнага руху;

— скліканне і правядзенне I Усебеларускага з'езда;

— абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР);

— абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.

2. Вызначыце прычынна-следчую сувязь паміж правядзеннем фарсіраванай індустрыялізацыі (звышіндустрыялізацыі) і пераходам да агульнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР і БССР у міжваенны перыяд.

3. Растлумачце змест наступных гістарычных тэрмінаў, скарачэнняў (абрэвіятур): ленінскі кааператыўны план; арцель, калгас, камуна, калектывізацыя, дваццаціпяцітысячнікі, кулак, серадняк, раскулачванне, МТС. Аб якіх працэсах і з'явах сацыяльна-эканамічнага і грамадскага развіцця БССР яны сведчаць?

4. Прачытайце дакумент, ахарактарызуйце пазіцыю аўтараў па вырашэнні пытання аб уладзе ў Мінску.

**"Приказ № 1 Исполнительного комитета Минского совета рабочих и солдатских депутатов. 25 октября 1917 г.**

К населению гор. Минска и окрестностей.

Власть в Петрограде перешла в руки Советов Рабочих, Солдатских и Крестьянских Депутатов. Весь Петроградский гарнизон, Балтийский флот и другие воинские части признали новую власть. Поступают отовсюду донесения, что армия и воинские части на всех фронтах признают новую власть, сохраняя полное спокойствие. В Минске власть перешла в руки Совета Рабочих и Солдатских Депутатов, который обратился ко всем революционным организациям и политическим партиям с предложением немедленно приступить к организации временной революционной власти на местах. Объявляя о происшедшем, Минский Совет Рабочих и Солдатских Депутатов доводит до сведения всех граждан, что им приняты самые решительные меры к охране революционного порядка и установлению полезной дисциплины повсюду. Установлена революционная цензура над всеми выходящими в Минске и получаемыми здесь газетами для предупреждения распространения волнующих население слухов.

г. Минск. 25 октября 1917 г. Исполнительный Комитет Минского Совета Рабочих и Солдатских Депутатов". *(Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён. Вучэбны дапаможнік.) / Пад агульнай рэд. праф. А.Ф.Вішнеўскага. Мн., 2003. С. 199.)*

5. Ахарактарызуйце прычыны выдання і пазіцыю аўтара (аўтараў) дакумента па вырашэнні пытання аб дзяржаўнасці Беларусі.

**Вытрымкі з Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі**

"Таварышы і Браты рабочыя, бедныя сяляне і чырвонаармейцы Беларусі!

Горацешная пакутная Беларусь, Беларусь рабочых і бедных селян, спершa доўгія вякі свайго жыцьця служыўшая сродкам для абагачэньня польскага вяльможнага панства-памешчыкаў, зломысных грашаўнікаў-купцоў і ўсялякіх багацеяў-крывасмокаў, а потым захопляная пад уціск расейскага крывавага самодзяржаўя з яго генэраламі і самаўладным чыноўніцтвам, адурваная ды абманваная з касцёльных амбоняў ксяндзамі і з царкоўных алтароў папамі, скутая з ног да галавы ланцугамі няволі, цярпеўшая здзекі і глум і паражыўшая цяжкае ярмо нямецкага прыгону, цяпер аслабаняецца ад доўгай векавой пакуты адважным наступам Чырвонае Арміі і прычашчаецца да новаго вольнаго жыцьця, якоя будуяцца на закладзінах камунізму, па фундаманце міжнароднае злукі працоўнага люду. <...>

Імям вякі цярпеўшай няволю, пакуту і здзек, а ад сяго дня вольнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, імям Чырвонае Арміі сацыяльнай рэвалюцыі, імям сусьветнага міжнароднага камунізма пастаўляная на варту Першым з'ездам Камуністычнай партыі Беларусі.

1) Часовае Работніча-Сялянскае Правіцыяльства Савецкай Беларускай Незалежнай Рэспублікі абвяшчая перад усім сьветам:

З гэтаго момэнту уся ўласьць на Беларусі прыналежыць толькі Саветам работнічых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. <...>

5) Ад сяго момэнту ўстаўляецца на Беларусі рэвалюцыйны парадак; усе супроціў-равалюцыйныя выступы і патугі зрабіць пагромы, грабежства і гвалтаваньня будуць няшчадна руйнавацца.

6) Рабочыя, селяне і працаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяў, якія жывуць на абшары Беларусі, карыстаюцца роўным правам і знаходзяцца пад абаронаю рэвалюцыйных законаў.

7) Уся зямля памешчыкаў і наагул буйных земляўласьнікаў, манастыраў, царквоў і касьцёлаў і духаўнікоў, з усім жывым і мяртвым багацьцем (інвентаром), а таксама ўсе лясы, воды і нутра зямлі становяцца дастаткам працаўнаго народу Беларусі.

8) Усе чыгункі і ўсе пуці злукі, пошты, цялягрaфы ды цяляхоны, фабрыкі, заводы і банкі абвяшчаюцца дастаткам рабочых і беднага селянства Беларусі. <...>

10) Уводзіцца восім гадзін у дзень для працы, бяз зверхурочных гадзін, на ўсялякуй рабоця і ўвайходзяць у моц усе дэкрэты РСФСР па забяспецы рабочаго стану.

Нехай жыве вольная працоўная Беларусь!

Нехай жыве савецкая Расея!

Нехай жыве сусьветная працаўнічая рэвалюцыя!

Імям вольнага Беларускага народу:

Старшыня Часовага Работніча-Сялянскага Правіцяльства Беларусі З.Жылуновіч

Сябры Правіцяльства А.Мяснікоў, С.Іваноў, Алесь Чарвякоў і І.Рэйнгольд.

1-го студня 1919 году. Менск". *(Гісторыя Беларусі, 1917—1945 гг.: 10 кл.: хрэст.: дапам. для вучняў / аўт.-склад. А.А.Каваленя; метад. забеспячэнне С.А.Кудрайцавай. Мн., 2009. С. 37—40.)*

**Расклад заняткаў у нямецкай школе для дзяўчынак у 1939—1940 гг.**

| Гадзіны | Панядзелак | Аўторак | Серада | Чацвер | Пятніца | Субота |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 8.00-8.45 | Ням. мова | Ням. мова | Ням. мова | Ням. мова | Ням. мова | Ням. мова |
| 8.50-9.35 | Геаграфія | Гісторыя | Спевы | Геаграфія | Гісторыя | Спевы |
| 9.40-10.25 | Расавае вучэнне | Расавае вучэнне | Расавае вучэнне | Ідэалогія | Ідэалогія | Ідэалогія |
| 10.25-11.00 | Вольны час, фізкультура, спецыяльныя праграмы | | | | | |
| 11.00-12.05 | Дамаводства, матэматыка (кажнадзённа) | | | | | |
| 12.10-12.50 | Расавая гігіена | | | | | |

**Расклад заняткаў у школе са змешаным складам вучняў у БССР у 1937—1941 гг.**

| Гадзіны | Панядзелак | Аўторак | Серада | Чацвер | Пятніца | Субота |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9.00-9.45 | Руская мова | Арыфметыка | Беларуская мова | Руская мова | Беларуская мова | Руская мова |
| 9.55-10.40 | Геаграфія | Гісторыя | Геаметрыя | Арыфметыка | Гісторыя | Геаметрыя |
| 10.50-11.35 | Фізічная культура | Руская літаратура | Геаграфія | Прыродазнаўства | Фізічная культура | Прырода-знаўства |
| 12.05-12.50 | Нямецкая мова | Канстытуцыя СССР | Працоўнае навучанне | Нямецкая мова | Арыфметыка | Канстытуцыя СССР |
| 13.00-13.45 | Беларуская літаратура | Музыка і спевы | Працоўнае навучанне | Беларуская літаратура | Рысаванне | Класны час |

**6.** Параўнайце расклады заняткаў у школе для дзяўчынак у Германіі і ў БССР у 1939—1940 гг.

7. Параўнайце змест задач з падручнікаў матэматыкі ў Германіі і ў БССР у 1939—1940 гг. для 4, 5 класаў. Як ідэалогія гэтых дзяржаў адлюстравана ў школьным навучанні?

• В церкви собралось 650 человек, богослужение продолжалось 2,5 часа. Сколько рабочих часов потеряно присутствовавшими?

• Из города поезд везет 5 вагонов с плугами, 4 вагона с сеялками, 3 вагона с тракторами. Сколько всего вагонов везет поезд для колхозов?

• В начале года в первом классе было 6 безбожников, теперь их уже 15. Сколько прибавилось в классе безбожников?

• Трем красноармейцам выдали для выполнения упражнения в меткости стрельбы 36 патронов. Один израсходовал 10 патронов, другой 11, третий 12. Сколько патронов у них осталось?

• По всему СССР выпущено за 5 дней 217 500 т чугуна, за 3 дня — 164 100 т стали и за 4 дня — 164 800 т проката. Сколько тонн металла могут выпустить все заводы СССР, если они работают непрерывно 365 дней?

• Стахановец за 2 месяца заработал 1856 руб. 30 коп., причем за второй месяц он заработал на 253 руб. 50 коп. больше, чем за первый месяц. Сколько денег он заработал за второй месяц?

• Максимальная скорость советского истребителя Як-1 470 км/ч, а немецкого истребителя "Мессершмит-109" на 90 км/ч больше скорости Як-1 и на 30 км/ч больше истребителя "Фокке-Вульф-190-А". Найдите скорости немецких истребителей и сравните их со скоростью Як-1.

• "Юнкерс" вылетел с грузом 12 дюжин бомб, каждая весом 10 кг. Самолет держит курс на Варшаву — центр мирового еврейства. Он бомбит этот город. При вылете с полной боевой нагрузкой и бензобаком, содержащим 1500 кг горючего, самолет весит 8 тонн. При возвращении из своего крестового похода он все еще имеет 230 кг горючего. Каков собственный вес самолета? *(Крыніца: http://www.ug.ru/archive/5990)*

**8.** Параўнайце суадносіны ваенных сіл СССР і Германіі ў паласе Заходняй Асобай ваеннай акругі (ЗахАВА) напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Зрабіце высновы адносна вайсковага патэнцыялу супрацьдзеючых бакоў. Свой адказ абгрунтуйце. *(гл. табліцу.) (Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для 11-го кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання / А.А.Каваленя, М.А.Краснова, В.І.Лемяшонак. Пад рэд. А.А.Каваленi, Н.С.Сташкевіча. Мн., 2012, С. 54.)*

**9.** Ахарактарызуйце пазіцыю і роль Зм.Жылуновіча і А.Чарвякова ў якасці кіраўнікоў Наркамнаца і Часовага работніцка-сялянскага ўрада ССРБ па пытанні стварэння беларускай дзяржаўнасці.

**10.** Ахарактарызуйце дзейнасць У.Пічэты і яго ўклад у развіццё беларускай навукі і адукацыі ў міжваенны перыяд.

**11.** Выкарыстоўваючы гістарычную карту, ахарактарызуйце геапалітычнае становішча Беларусі пасля дэнансацыі Рыжскага міру і заключэння Дагавора "Аб дружбе і граніцах" паміж Германіяй і СССР.

**12.** Вызначыце, з якой гістарычнай падзеяй звязаны прыведзеныя ніжэй дакументы. Параўнайце пазіцыі аўтараў дакументаў і іх аргументацыю.

**Вытрымка з паведамлення ТАСС ад 14 чэрвеня 1941 г.**

"...Германия также неуклонно соблюдает условия советско-германского пакта о ненападении, как и Советский Союз, ввиду чего, по мнению советских кругов, слухи о намерении Германии порвать пакт и предпринять нападение на СССР лишены всякой почвы, а происходящая в последнее время переброска германских войск, освободившихся от операций на Балканах, в восточные и северо-восточные районы Германии связана, надо полагать, с другими мотивами, не имеющими касательства к советско-германским отношениям. СССР, как это вытекает из его мирной политики, соблюдал и намерен соблюдать условия советско-германского пакта о ненападении, ввиду чего слухи о том, что СССР готовится к войне с Германией, являются лживыми и провокационными...". "Известия", 14 июня 1941 г.

**Вытрымка з заявы Міністэрства замежных спраў Германіі 21 чэрвеня 1941 г. ураду СССР**

"...Вопреки всем взятым на себя обязательствам и в явном противоречии со своими торжественными декларациями советское правительство повернуло против Германии. Оно <...> во всё большей мере придавало своей внешней политике враждебный Германии характер и <...> сосредоточило на германской границе все свои вооруженные силы, готовые к броску. Тем самым советское правительство предало и нарушило договоры и соглашения с Германией. Ненависть большевистской Москвы к национал-социализму оказалась сильнее политического разума. ...Большевистская Москва намеревается нанести удар в спину национал-социалистической Германии, которая ведет борьбу за свое существование. Германия не намерена смотреть на эту серьезную угрозу своим восточным границам и ничего не делать. Поэтому Фюрер отдал германскому Вермахту приказ отразить эту угрозу всеми имеющимися в его распоряжении средствами. Немецкий народ понимает, что в грядущей борьбе он <...> призван спасти весь культурный мир от смертельной опасности большевизма и открыть путь к истинному социальному подъему в Европе. Берлин, 21 июня 1941 года".

*Табліца*

| | Дывізіі | Асабовы склад | Гарматы і мінамёты | Танкі | Самалёты |
|---|---|---|---|---|---|
| ЗахАВА | 55 | 672 000 | 10 087 | 2502 | 1909 |
| Група армій "Цэнтр" | 47 | 820 000 | 10 763 | 1177 | 1468 |

**З выступлення В.Молатава па радыё 22 чэрвеня 1941 г.**

"Граждане и гражданки Советского Союза!

...Сегодня, в 4 часа утра, без предъявления каких-либо претензий к Советскому Союзу, без объявления войны, германские войска напали на нашу страну, атаковали наши границы во многих местах и подвергли бомбежке со своих самолетов наши города. ... Это неслыханное нападение на нашу страну является беспримерным в истории цивилизованных народов вероломством. Нападение на нашу страну произведено, несмотря на то, что между СССР и Германией заключен договор о ненападении и Советское правительство со всей добросовестностью выполняло все условия этого договора. Нападение на нашу страну совершено, несмотря на то, что за все время действия этого договора германское правительство ни разу не могло предъявить ни одной претензии к СССР по выполнению договора. Вся ответственность за это разбойничье нападение на Советский Союз целиком и полностью падает на германских фашистских правителей. <...> Германский посол в Москве Шуленбург <...> сделал заявление от имени своего правительства о том, что германское правительство решило выступить с войной против СССР в связи с сосредоточением частей Красной Армии у восточной германской границы. В ответ на это мною от имени Советского правительства было заявлено, что до последней минуты германское правительство не предъявляло никаких претензий к Советскому правительству, что Германия совершила нападение на СССР, несмотря на миролюбивую позицию Советского Союза, и что тем самым фашистская Германия является нападающей стороной.

По поручению правительства Советского Союза я должен также заявить, что ни в одном пункте наши войска и наша авиация не допустили нарушения границы, и поэтому сделанное сегодня утром заявление румынского радио, что якобы советская авиация обстреляла румынские аэродромы, является сплошной ложью и провокацией. Такой же ложью и провокацией является вся сегодняшняя декларация Гитлера, пытающегося задним числом состряпать обвинительный материал насчет несоблюдения Советским Союзом советско-германского пакта...

Правительство призывает вас, граждане и гражданки Советского Союза, еще теснее сплотить свои ряды вокруг нашей славной большевистской партии, вокруг нашего Советского правительства, вокруг нашего великого вождя тов. Сталина. Наше дело правое. Враг будет разбит. Победа будет за нами". "Правда", 23 июня 1941 г.

**З выступлення І.Сталіна па радыё 3 ліпеня 1941 г.**

"Товарищи! Граждане! Братья и сестры! Бойцы нашей армии и флота!

К вам обращаюсь я, друзья мои! Вероломное военное нападение гитлеровской Германии на нашу родину, начатое 22 июня, — продолжается. Несмотря на героическое сопротивление Красной Армии, несмотря на то, что лучшие дивизии врага и лучшие части его авиации уже разбиты и нашли себе могилу на полях сражения, враг продолжает лезть вперед, бросая на фронт новые силы. Гитлеровским войскам удалось захватить Литву, значительную часть Латвии, западную часть Белоруссии, часть Западной Украины. Фашистская авиация расширяет районы действия своих бомбардировщиков, подвергая бомбардировкам Мурманск, Оршу, Могилев, Смоленск, Киев, Одессу, Севастополь. Над нашей родиной нависла серьезная опасность. Как могло случиться, что наша славная Красная Армия сдала фашистским войскам ряд наших городов и районов? Неужели немецко-фашистские войска в самом деле являются непобедимыми войсками, как об этом трубят неустанно фашистские хвастливые пропагандисты? Конечно, нет! История показывает, что непобедимых армий нет и не бывало. <...> Что касается того, что часть нашей территории оказалась все же захваченной немецко-фашистскими войсками, то это объясняется главным образом тем, что война фашистской Германии против СССР началась при выгодных условиях для немецких войск и невыгодных для советских войск. Дело в том, что войска Германии, как страны, ведущей войну, были уже целиком отмобилизованы, и 170 дивизий, брошенных Германией против СССР и придвинутых к границам СССР, находились в состоянии полной готовности, ожидая лишь сигнала для выступления, тогда как советским войскам нужно было еще отмобилизоваться и придвинуться к границам. Немалое значение имело здесь и то обстоятельство, что фашистская Германия неожиданно и вероломно нарушила пакт о ненападении, заключенный в 1939 г. между ней и СССР, не считаясь с тем, что она будет признана всем миром стороной нападающей. Понятно, что наша миролюбивая страна, не желая брать на себя инициативу нарушения пакта, не могла стать на путь вероломства". "Известия", 4 июля 1941 г.

**13.** Якой падзеі прысвечаны твор знакамітага беларускага мастака Валянціна Волкава? Чым можна растлумачыць вялікі эмацыйны ўздым удзельнікаў падзеі?

14. Сфармулюйце сваё меркаванне аб вытоках Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

15. Вызначыце, якім гістарычным падзеям прысвечаныя плакаты, а таксама адзначце адносіны аўтараў-мастакоў да гэтых гістарычных падзей.



*Валянцін Волкаў. "Мінск. 3 ліпеня 1944 года".*




*Плакат 1925 года.*




*Плакат А. Галаванава.*

Такім чынам, прапанаваныя заданні дазваляюць сфарміраваць розныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходныя для паспяховай здачы абавязковага экзамену па гісторыі Беларусі па трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі.